# Спецыфіка жанру нон-фікшн (на матэрыяле аповесці А. Брава "Каменданцкі час для ластавак")

*В. А. Сахар*
*БДПУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – Н. В. Заяц, канд. філалаг. навук, дац.*

**Анатацыя.** У артыкуле на матэрыяле аповесці А. Брава "Каменданцкі час для ластавак" вылучаюцца і даследуюцца асаблівасці жанру нон-фікшн, разглядаюцца асноўныя мастацкія прыёмы, паказваецца адрозненне ад белетрыстыкі.

**Ключавыя словы:** нон-фікшн; аповесць; аўтар; мастацкая дакументалістыка.

Нон-фікшн – твор у якім у адрозненне ад белетрыстыкі не дапускаецца выдумка, апісваюцца рэальныя гісторыі, падзеі выкладаюцца праз прызму ўспрымання аўтара. Усе падзеі павінны быць заснаваны на дакументальнай аснове. У гэтым літаратура нон-фікшн блізкая да публіцыстыкі. Узнікненне жанру датуецца 1965 годам, калі быў апублікаваны раман амерыканскага пісьменніка Трумана Капотэ "Звычайнае забойства" ("In Cold Blood"), які сёння лічыцца першым творам літаратуры нон-фікшн.

У сучаснай беларускай літаратуры творы нон-фікшн прадстаўлены вельмі шырока, прыцягваюць увагу крытыкаў, карыстаюцца папулярнасцю ў чытачоў. Сярод падобных кніг "Мае дзевяностыя" А. Бахарэвіча, "Радзіва Прудок" і "Прэм'ера" А. Горвата, творы А. Федарэнкі і інш. Яркім узорам нон-фікшн з'яўляецца аповесць А. Брава "Каменданцкі час для ластавак", якая прынесла пісьменніцы вядомасць і прызнанне: аднайменная кніга была адзначана ў 2004 годзе літаратурнай прэміяй "Гліняны Вялес" [1].

У адным з інтэрв'ю, разважаючы над пытаннем адрознення праўды літаратуры ад праўды жыцця, А. Брава сказала: "Жыццё поўнае шалупіння, другараднага і неістотнага, бытавога смецця, за якім губляюцца рысы тыповага. Не капіраваць рэальнасць слепа, а <...> вылушчыць з абалонак ядзерка ісціны і ёсць справа літаратуры. Толькі тады яна зможа ўражваць, абуджаць, расплюшчваць вочы" [4]. Гэтым прынцыпам – вылучаць з плыні жыцця "ядзерка ісціны" – А. Брава кіруецца ў літаратурнай творчасці.

За аснову нон-фікшн твора звычайна бяруцца пэўныя ўражанні аўтара, якія ён атрымаў у нейкі перыяд свайго жыцця і занатаваў. Асновай аповесці А. Брава стаў асабісты досвед пісьменніцы: яе знаходжанне на сацыялістычнай Кубе. Пачаткам

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прыгод стала знаёмства падчас вучобы з кубінскім студэнтам, узаемнае каханне, якое абярнулася шлюбам і пераездам на радзіму маладога мужа. “З’яўленне твора сталася магчымым дзякуючы звычцы, якую маю з дзяцінства: весці дзённік. Падрабязна занатоўваць кубінскія ўражанні пачала ў час плавання па Атлантыцы і скончыла апошнім сваім днём у Санцьяга-дэ-Куба” [Цыт. па: 3].

Праз прызму ўспрыняцця пісьменніцы ў аповесці адлюстроўваецца адметнасць існавання кубінцаў: “*...Немаўляты, перад якімі жыццё па правілах гульні вось-вось пачне разгортваць свае яркія цацкі-прынады, спакусліва шамацець стракатымі паперкамі ласункаў, завабліваць і гэтую даверлівую душу туды, дзе, апавітая ружамі і драпежным плюшчом, прыхавана клетка, – каб потым, калі чарговая ахвяра трапіць у пастку, адразу ж перастаць прыкідвацца і паддобрывацца, як той хітры палітык пасля выбараў*” [2, с. 2].

Перадаецца ў творы і побытавая неўладкаванасць жыцця, калі з аднаго таза мыюць падлогу, а пасля мыюць у ім дзіця; калі ва ўсіх крамах тавар прадаецца па талонах: “*Прадуктовыя чэргі, інакш тут не прыдбаеш нават жменькі сухога гароху, з якога мы гатуем суп-чычара. <...> прадукты і тавары першай неабходнасці, якія адпускаюцца па тархеце, гэта значыць, картцы (тархета тут – асноўны дакумент, без яе проста аддасі Богу душу ад голаду): адну лібру рыса, невялічкія пакункі з чорнай фасоляй і гарохам, пачак цыгарэт, пачак запалак, трошкі цукру, трошкі кавы – маці Божая, і з гэтым мы маем пратрымацца тыдзень?!*” [2, с. 7].

Паказ рэчаіснасці без мастацкай апрацаванасці – адзін з галоўных прынцыпаў літаратуры нон-фікшн. “Падзеі, пакладзеныя ў аснову нон-фікшн рамана, абавязкова павінны быць рэальнымі і амаль без мастацкай апрацоўкі. Гэта выразна адрознівае нон-фікшн ад белетрыстыкі. Нягледзячы на тое, што аўтар мастацкага твора таксама можа апісваць рэальныя жыццёвыя абставіны або гістарычныя факты, у яго волі прыдумваць герояў, якіх не існавала ў рэальнасці. <…> Аўтар нон-фікшн рамана усяго гэтага дазволіць сабе не можа” [5]. Вялікая ўвага ў творах нон-фікшн надаецца пачуццям і перажыванням аўтара, нярэдка яны дамінуюць над апісаннем падзей. Аповесць мае пэўныя адзнакі дзённіка, у якім занатоўваюцца складаныя эмоцыі закінутай на чужыну маладой жанчыны: “*Што ж, грэх вінавацiць зоркі ў тым, што на маёй радзіме, якую я пакінула* ***назаўсёды*** *(слова, у якое немагчыма паверыць), на маёй радзіме, дзе прастору крояць размашыста і няскупа, даючы велічэзныя прыпускі на швы, а будынкі не налязаюць адзін на другі нібы дэкарацыі з пап’е-машэ ў правінцыйным тэатры, – на маёй радзіме пра мяне забыліся*” [2, с. 6]. Галоўнае тут не тое, **што** перажывае гераіня, а **як** перажывае, якія ў яе пры гэтым пачуцці. Аўтар жанру нон-фікш не можа надаваць тыя ці іншыя якасці свайму герою, акрамя сапраўдных: героі павінны стварацца з дакументальнай дакладнасцю, што

РЭПОЗИТОРИЙ БГПУ

выяўляецца ў аповесці А. Брава. Яе гераіня – сама пісьменніца – усё апісанае вытрывала на сабе.

У аповесці “Каменданцкі час для ластавак” апісваюцца не толькі эмацыйныя перажыванні пісьменніцы, але і рэчаіснасць. Тут шмат разважанняў пра жыццё на Беларусі і на Кубе, асаблівасці светапогляду двух народаў, палітычны лад, што дае падставы гаварыць аб прысутнасці ў творы гістарычных звестак, вельмі характэрных для “нявыдумнай прозы”: “*І раптам аказацца ў краіне, дзе “Маскоўскія навіны” і “Спадарожнік” былі забаронены за абразлівы <…> выпад супраць Брэжнева, гэтага блазна, пра якога мы яшчэ ў школе склалі вершык: “Бровы мае ён густыя, словы шамкае пустыя…”! У краіне, дзе амерыканскае “Радыё Марці” (“радыё гусанас”, як зняважліва называлі яго тутэйшыя функцыянеры) слухаюць у навушніках, каб суседзі не данеслі ў CDR!*” [2, с. 12].

Для таго, каб стварыць вобраз героя, у творах нон-фікшн выкарыстоўваюцца такія прыёмы, як дыялог, раскрыццё персанажа праз мастацкую дэталь, а таксама апісанне падзей з пункта гледжання іх удзельніка. Усе названыя прыёмы прысутнічаюць у аповесці “Каменданцкі час для ластавак”. Мастацкай дэталлю, што мае важнае значэнне ў разуменні канцэпцыі твора, з’яўляецца вобраз-сімвал ластаўкі. Для ўвасаблення лёсу жанчыны на чужыне А. Брава выбірае менавіта гэтую птушку, бо “*ластаўкі робяць гнёзды не з галінак, як іншыя птушкі, а лічы, з бруду – з гліны ды зямлі, змяшаных са слінаю, і лепяць іх зноў жа не на дрэвах, а прымацоўваюць куды заўгодна: да балконаў, карнізаў. Яны здольныянарадзіць і выхаваць патомства практычна ў любых ўмовах. Вос толькі ў клетцы жыць не могуць…*” [2, с. 23–24]. Пісьменніца сцвярджае, што жанчыны ад пачатку жыцця “*асуджаны на паразу*”: “*Ты будзеш біцца грудзьмі аб пруты клеткі, грызці, як ваўчанё, жалеза пасткі, выць і разгойдваць сцены сваёй турмы. У дрэнныя хвіліны ты нават падумаеш пра тое, што калісьці, шаснаццаць год таму, здзейсніла злачынства, няхай па неасцярожнасці, як пішуць ў канстатуючай частцы прысудаў, бо ты была маладзенькай дурнічкай, якая шукала кахання і шчасця, і таму асудзіла* ***яшчэ адну душу на жыццё*** *(хіба не злачынства – нараджаць дзяцей у гэты свет, які ён цяпер ёсць? якім ён заўсёды быў?!), – але тут жа і абвергнеш сама сябе: не, тое было не злачынства, а –* ***ахвяра****, якую ты заўсёды прагла знайсці ў каханні да мужчыны, а зведала ў мацярынстве. На тую ахвяру ты асуджана самой сваёй жаночай сутнасцю*” [2, с. 107]. Тым не менш нельга лічыць аповесць песімістычнай, бо гераіня усё ж такі спадзяецца на лепшае – калі не для сябе, то для сваёй дачкі.

Часты прыём нон-фікшн – “пагружэнне ў свет герояў. Для гэтага аўтару твора прыходзіцца на час змяніць прафесію або памяняць увесь лад свайго жыцця для таго, каб “на ўласнай скуры” адчуць хараство і нягоды жыцця людзей, якіх ён

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

апісвае” [5]. А. Брава не прыйшлося змяняць сваё жыццё, яна проста занатавала некалі перажытае, што цалкам адпавядае патрабаванням жанру нон-фікшн.

### Літаратура


1. Алена Валер’еўна Брава [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki. – Дата доступу: 01.03.2019.
2. Брава, А. Каменданцкі час для ластавак : аповесць [Электронны рэсурс] / А. Брава // Kamunikat.org: Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка. – Рэжым доступу: http://kamunikat.org/8643.html?pubid=11259&lang=PL. – Дата доступу: 01.03.2019.
3. Алена Брава “Каменданцкі час для ластавак (сборник)” – рецензия [Электронный ресурс] // LivLib: Книжный портал с персональными рекомендациями и личными коллекциями. – Режим доступа: https://www.livelib.ru/review/859411-kamendantski-chas-dlya-lastavak-sbornik-alena-brava. – Дата доступа: 01.03.2019.
4. Браво, Е. Диалог со временем : интервью-послесловие [Электронный ресурс] / А. Браво // Prastora.by. – Режим доступа: http://prastora.by/knihi/brava-aliena-daravannie. – Дата доступа: 01.03.2019.
5. Новиков, А. Что такое “нон-фикшн”? [Электронный ресурс] / А. Новиков // ЛитКритика.by: Белорусский литературный портал. – Режим доступа: https://litkritika.by/categories/literatura/raznoe/2161.html. – Дата доступа: 01.03.2019.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Маральна-этычныя праблемы ў творах Івана Шамякіна пра сучаснасць (на матэрыяле аповесці “Драма”)


*Х. Л. Сузінь*
*БДПУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – І. М. Гоўзіч, канд. філалаг. навук, дац.*



**Анатацыя.** На матэрыяле аповесці І. Шамякіна “Драма” разглядаюцца маральна-этычныя праблемы, якія закраналіся ў беларускай літаратуры мяжы XX–XXI стагоддзяў, звяртаецца ўвага на эвалюцыю вобраза жанчыны.



**Ключавыя словы:** маральна-этычныя праблемы; перабудова; феміністычны дыскурс; маральны канфлікт.


Беларуская літаратура мяжы XX–XXI стагоддзяў надзвычай чуйна рэагавала на змены ў грамадска-палітычнай сітуацыі і свядомасці людзей савецкага перыяду, звярталася да асэнсавання праблем сучаснасці, якія выклікалі непрыманне і крытыку